ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

ОРГАН БРЭСЦКАГА АБКОМА КП(б)Б
І АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 129 (500) II Серада 4 чэрвеня 1941 г. II Цана 15 кап.

Таварышы! Усе, як адзін, падпішамся на новую пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года), пазыку далейшага росквіту і магутнасці Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Пазыка далейшага росквіту Совецкай дзяржавы

Сёння ў «Звяздзе» публікуецца пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР аб выпуску дзяржаўнай пазыкі Трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года) на 9 мільярдаў 500 мільёнаў рублёў. Пазыка выпускаецца, як указваецца ў пастанове Совета Народных Камісараў Саюза ССР, у мэтах прыцягнення зберажэнняў насельніцтва на выкананне задач гаспадарча-культурнага будаўніцтва, узмацнення дзяржаўных рэзерваў і далейшага ўмацавання абаронай магутнасці Совецкага Саюза.

Як толькі радыёхвалі прынеслі змест гэтай пастановы, прапоўныя паўсямесна — на прадпрыемствах, ва ўстановах і калгасах сабраліся на кароткія мітынгі, каб вітаць пастанову ўрада аб выпуску новай пазыкі, каб тут-жа пачаць падпіску.

На Мінскім станкабудаўнічым заводзе ім. С. М. Кірава адзін за адным выступалі рабочыя і служачыя. Інжынер завода тав. Шлапакоў у сваім кароткім выступленні заявіў: — У нас вялікае свята. Совецкі ўрад выпусціў новую пазыку. Мы вельмі добра ведаем, што нашы грошы ідуць на будаўніцтва новых фабрык, заводаў, школ, на ўмацаванне нашай абаронай магутнасці. Я падпісваюся на 100 процантаў свайго месячнага заработку.

Тав. Бал — малады грамадзянін Совецкага Саюза, рабочы гэтага-ж завода, які яшчэ нядаўна марнеў у былой панскай Польшчы, сказаў:

— У былой панскай Польшчы рабочых сілай прымушалі падпісвацца на пазыку, адбіралі апошнія грошы. На сваёй совецкай радзіме я з велізарным задавальненнем падпісваюся на пазыку, якая яшчэ больш палепшыць наша шчаслівае жыццё.

На праходзячых мітынгах за ўсіх гаратах рэспублікі ў яркіх і натхнёных прамовах працоўныя выражаюць сваё глыбокае задавальненне выпускам новай пазыкі, якая яшчэ больш умацуе гаспадарчую і ваенную магутнасць Совецкага Саюза, яшчэ больш узбагаціць навейшай тэхнікай родную Чырвоную Армію і Чырвоны Флот.

Наш народ, народ-герой з законнай гордасцю азіраецца на пройдзены пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна шлях барацьбы і перамог. З краіны адсталай, з краіны бескультур'я і галечы, з турмы народаў, якой была царская Расія, наша радзіма за годы совецкай улады намаганнем рэволюцыйнага народа, на чале з партыяй большэвікоў, у жорсткай барацьбе са знешнімі і ўнутранымі ворагамі — ператварылася ў перадавую ў свеце індустрыяльную краіну з самай буйнай сельскай гаспадаркай, у краіну перадавой навукі і мастацтва. Яна стала краінай перамогшага соцыялізма—бацькаўшчынай сусветнага рабочага класа.

Усё гэта дасягнута сіламі і намаганнямі самога народа, за лік унутраных рэсурсаў, без дапамогі і кабальных здзелак з капіталістычнымі краінамі. Яшчэ ў 1926 годзе, калі наша партыя разгортвала барацьбу за соцыялістычную індустрыялізацыю краіны, таварыш Сталін у сваім дакладзе «Аб гаспадарчым становішчы Совецкага Саюза» гаворыў:

«Гісторыя ведае розныя спосабы індустрыялізацыі. Англія індустрыялізіравалася дзякуючы таму, што яна грабіла дзесяткі і сотні год калоніі, зрабіла там дадатковыя капіталы, укладвала іх у сваю прамысловасць і паскарала тэмп сваёй індустрыялізацыі. Гэта адзін спосаб індустрыялізацыі. Германія паскорыла сваю індустрыялізацыю ў рэзультаце пабеданосной вайны з Францыяй у 70-годах мінулага стагоддзя, калі яна, узяўшы 5 мільярдаў кантрыбуцыі ў французаў, уліла іх у сваю прамысловасць. Гэта другі спосаб індустрыялізацыі. Абодва гэтыя спосабы для нас закрыты, бо мы — краіна Советаў, бо каланіяльныя грабяжы і ваенныя захваты ў мэтах грабяжу не сумяшчальны з прыродай совецкай улады. Расія, старая Расія здавала кабальныя концэсіі і атрымлівала кабальныя пазыкі, стараючыся такім чынам выбрацца паступова на шлях індустрыялізацыі. Гэта ёсць трэці спосаб. Але гэта — шлях кабалы, або поўкабалы, шлях ператварэння Расіі ў поўколонію. Гэты шлях таксама закрыты для нас, бо не для таго мы вялі трохгадовую грамадзянскую вайну, адбіваючы ўсіх і ўсякіх інтэрвенцыяністаў, каб потым пасля перамогі над інтэрвенцыяністамі добраахвотна пайсці ў кабалу да імперыялістаў. Астаецца чацверты шлях індустрыялізацыі, шлях уласных зберажэнняў для справы прамысловасці, шлях соцыялістычнага накаплення, на які неадпаразова ўказваў таварыш Ленін, як на адзіны шлях індустрыялізацыі нашай краіны».

І совецкі народ пайшоў па шляху, указанаму Леніным і Сталіным, з года ў год памнажаючы свае поспехі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

За апошнія два годы совецкі народ, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, упісаў новую слаўную старонку ў гісторыю свайго развіцця, дасягнуў новых перамог у будаўніцтве комуністычнага грамадства. Любімая народам Чырвоная Армія па загаду совецкага ўрада вызваліла працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад ярма польскіх паноў. Працоўныя Бесарабіі і Паўночнай Букавіны вызвалены ад ярма румынскіх баяр. Установлена совецкая ўлада ў Літве, Латвіі і Эстоніі, якія ўвайшлі ў састаў вялікага Совецкага Саюза. Зруйнаван варожы ваенны плацдарм пад горадам Леніна. Капіталістычнаму свету прышлося адступіць, а Совецкі Саюз вырас з 11 да 16 роўнапраўных брацкіх Саюзных рэспублік.

1941 год для совецкага народа з'яўляецца годам грандыёзных работ па далейшаму ўмацаванню гаспадарчай і абаронай магутнасці краіны. У капітальнае будаўніцтва ўкладаецца 57 мільярдаў рублёў, г. зн. у паўтара раза больш, чым у 1940 годзе. На соцыяльна-культурныя патрэбы асігнуецца 47,8 мільярда рублёў, што на 14,6 проц. больш, чым у мінулым годзе, на сельскую гаспадарку — 13,5 мільярда рублёў, на патрэбы абароны краіны—70 мільярдаў 900 мільёнаў рублёў. У 1941 годзе будуюцца 2.955 новых і расшыраюцца існуючыя прамысловыя прадпрыемствы.

Совецкі Саюз не можа не ўлічыць таго, што сучасная міжнародная абстаноўка чравата ўсякімі нечаканасцямі, што сучасная вайна з'яўляецца вайной матораў, вайной рэзерваў. Урад Совецкага Саюза прымае ўсе меры да таго, каб яшчэ больш узброіць сваю Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот перадавой тэхнікай, трымаць краіну ў стане поўнай баявой гатоўнасці.

У бюджэце Совецкага Саюза немалаважнае месца займаюць пазыкі. У даходах дзяржаўнага бюджэта 1941 года прадугледжана паступленне ад дзяржаўных пазык, рэалізуемых па падпісцы сярод насельніцтва, 10 мільярдаў 375 мільёнаў рублёў. У рэалізацыі совецкіх дзяржаўных пазык самы актыўны ўдзел прымае насельніцтва СССР. Патрыёты нашай радзімы ведаюць, што іх пазыка дзяржаве ідзе на палепшэнне добрабыту народа, на будаўніцтва новых самалётаў, танкаў, гармат, ідзе на абарону радзімы.

Беларускі народ, як і ўсе народы вялікага Совецкага Саюза, горача падтрымліваючы выпуск дзяржаўных пазык, актыўна падпісваецца на іх. На пазыку Трэцяй пяцігодкі (выпуск трэцяга года) падпісалася звыш 2.400 тысяч працоўных нашай рэспублікі на суму ў 321 мільён рублёў.

Няма сумнення, што і ў гэтым годзе працоўныя Совецкай Беларусі аднадушна падпішуцца на новую пазыку і гэтым прадэманструюць сваю безмежную адданасць радзіме, вялікаму Сталіну.

Задача партыйных, совецкіх, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый — шырока растлумачыць насельніцтву ўмовы новай пазыкі, азнаёміць іх з тым, куды і на што ідуць пазыкі і якую карысць яны прынясуць пазыкатрымальнікам.

Дружнай падпіскай на новую пазыку будзем умацоўваць магутнасць нашай любімай радзімы.

Падпішамся, таварышы, на новую пазыку Трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года), пазыку далейшага росквіту Совецкай дзяржавы!

(Перадавы артыкул «Звязды» за 3 чэрвеня).

Дружнай падпіскай на новую пазыку яшчэ больш умацуем магутнасць нашай любімай радзімы!

Пагранічнікі падпісваюцца на пазыку

У падраздзяленнях П-скага чырвонасцяжнага пагранічнага атрада ў кожнага рэпрадуктара група байцоў і камандзіраў. Уважліва, імкнучыся не прапусціць ні аднаго слова, слухалі пагранічнікі пастанову ўрада і прамову Народнага Камісара фінансаў СССР тав. Зверэва аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года).

Адразу-ж пасля слухання пастановы Соўнаркома СССР сярод байцоў і камандзіраў разгарнулася падпіска на новую пазыку. Патрыёты-пагранічнікі т. т. Белаш, Карданюк, Трафімаў, Кандрацьеў, Зайцаў, Путышоў і другія першыя падпісаліся на пазыку і заклікалі паследаваць іх прыкладу ўсіх байцоў падраздзялення. Тав. Трафімаў, падпісваючыся на пазыку, заявіў:

— Совецкія пазыкі — гэта сапраўды народныя пазыкі. Я з радасцю падпісваюся на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі, бо я ведаю, што нашы пазыкі накіраваны на далейшы росквіт нашай радзімы, на палепшэнне добрабыту працоўных, на ўмацаванне абаронай магутнасці краіны Советаў. Я падпісваюся на 50 рублёў і заклікаю паследаваць майму прыкладу ўсіх байцоў падраздзялення лейтэнанта тав. Дуньшакова.

Адзін за другім дружна падпісваліся пагранічнікі на пазыку.

У 20 гадзін 2 чэрвеня ў клубе атрада адбыўся мітынг байцоў, камандзіраў і сем'яў пачсастава. Выступаючыя байцы і камандзіры віталі пастанову ўрада і заклікалі усіх пагранічнікаў дружна падпісацца на пазыку.

Так чырвоназармец Ускоў у сваім выступленні гаварыў:

— Ураган другой імперыялістычнай вайны бушуе ў Еўропе, Азіі, Афрыцы. Вайна ідзе па сушы, па марах і ў паветры. І толькі Совецкі Саюз стаіць ўпе вайны. Мы павінны заўсёды памятаць указанне таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні, і наша задача усямерна ўмацоўваць абаронную магутнасць нашай любімай радзімы, мацаваць нашу непераможную Чырвоную Армію. Мы не можам і не павінны стаяць у баку. Я падпісваюся на 50 рублёў і ўпэўнен, што ўсе байцы паследуюць майму прыкладу і, як адзін, падпішуцца на пазыку.

Чырвонаармеец тав. Табачнікаў сказаў:

— З небывалым уздымам пагранічнікі падраздзялення лейтэнанта тав. Другава сустрэлі Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года). Гэта пазыка дапаможа нам выканаць народна-гаспадарчы план 1941 года — чацвертага года трэцяй сталінскай пяцігодкі. З пескрываемай радасцю я падпісваюся на пазыку ў суме 75 рублёў і заклікаю ўсіх байцоў нашага падраздзялення падпісацца не менш чым на месячнае грашовае ўтрыманне. Мы добра ведаем, што кожная наша капейка пойдзе на патрэбы абароны краіны соцыялізма.

У дзень выпуску пазыкі ў падраздзяленні лейтэнанта тав. Дуньшакова да 22 гадзін была закончана падпіска на пазыку. Падпіска складае 144,4 процанта заработнай платы камандзіраў і месячнага ўтрымання байцоў.

Н. Барынаў.

ВЫСОКАЯ АРГАНІЗАВАНАСЦЬ

Друкарня ім. Варашылава мае 236 рабочых і служачых. У перспектыве — далейшае, яшчэ больш шпаркае павелічэнне рабочага калектыва. Другога чэрвеня на двары друкарні сабраліся рабочыя, сярод іх дырэктар тав. Каган. Ён трымае ў руках толькі што атрыманую тэлеграму аб тым, што з Гомеля ў Брэст адгружана ратацыйная машына. І ўсе сабраўшыяся адчуваюць гэты пераможны рух прадпрыемства наперад, які адлюстроўвае працвітанне новых заходніх абласцей, рост індустрыяльнай магутнасці краіны.

З напружанай увагай слухалі сабраўшыяся перададзеную па радыё пастанову ўрада СССР аб выпуску новай пазыкі, падпісаную главой совецкага ўрада вялікім Сталіным. Пачынаецца мітынг. Яго адкрывае сакратар партыйнай арганізацыі друкарні тав. Пронціна.

Адзін за адным выступаюць рабочыя. Яны горача вітаюць пастанову ўрада аб выпуску пазыкі, гавораць аб гатоўнасці совецкіх людзей аддаць сваю працу, свае сродкі сваёй соцыялістычнай дзяржаве.

Дэпутат гарадскога совета стары машыніст тав. Чэратовіч, які зараз у якасці інструктара рыхтуе новыя кадры кваліфікаваных друкароў, гаворыць аб велізарных штодзённых клопатах комуністычнай партыі і совецкага ўрада аб добрабыце працоўных, напамінае аб палымяючых на ўсім капіталістычным свеце пажары імперыялістычнай бойні і аб абавязку кожнага совецкага чалавека ўсімі сіламі і сродкамі мацаваць сваю радзіму. Ён заяўляе, што падпісваецца на месячны заработак.

Наборшчык тав. Ольдак гаворыць на польскай мове. Ён заяўляе:

— Я з вялікай радасцю даю ў пазыку дзяржаве свой месячны заработак, бо ведаю, што гэта я даю самому сабе, свайму народу, бо ведаю, што кожны пяты завод, пятая шахта, санаторыя, школа пабудаваны у нас па сродкі ад народных пазык. Мы разумеем, што мірнае жыццё і праца совецкага народа забяспечаны магутнай Чырвонай Арміяй. Нашы сродкі пойдуць на яшчэ большае ўмацаванне бацькаўшчыны працоўных усяго свету—СССР.

Наша дружная падпіска на пазыку з'явіцца магутнай палітычнай дэманстрацыяй нашага адзінства, згуртаванасці вакол совецкага ўрада, які ўзначальвае вялікі правадыр таварыш Сталін.

Актыўнасць на мітынгу была надзвычайна высокая. Выступіла 12 чалавек. На розных мовах і з розным тэмпераментам усе яны адзінадушна віталі пастанову ўрада. Пажылы яўрэй рабочы Шапіра і маладая полька работніца Палуска, малады комсамолец Ладычэц, прадстаўнікі двух пакаленняў наборшчыкаў — бацька і сын Тобішляк гаварылі з поўным разуменнем вялікіх і адказных задач, ускладаемых на кожнага совецкага рабочага і работніцу сучаснай міжнароднай абстаноўкай.

Адразу пасля мітынга па цэхах пачалася падпіска на пазыку. Яна праходзіла з высокай арганізаванасцю і ўздымам. Прышлі падпісвацца і людзі, якія знаходзяцца ў адпачынку. Пераважная большасць рабочых і служачых падпісалася на месячны аклад. Праз 2,5 гадзіны пасля пачатку падпіскі па друкарні на пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) падпісалася 228 чалавек (97 процантаў усіх работнікаў) на суму у 58.715 рублёў.

Асабліва дружна правялі падпіску рабочыя машыннага цэха.

А. РАБІНОВІЧ

45985 рублёў у пазыку сваёй дзяржаве

Як толькі гудок апавясціў канец рабочага дня, з усіх цэхаў брэсцкага водачнага завода рабочыя накіраваліся у клуб на мітынг, прысвечаны выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года).

Мітынг адкрывае сакратар партыйнай арганізацыі тав. Курусь. Кароткую ін- фармацыю робіць дырэктар завода тав. Сперанскі.

— З кожным днём, — гаворыць ён, — расце магутнасць нашай дзяржавы. На пустырах, дзе раней не ступала нага чалавека, вырастаюць заводы, фабрыкі, домны, шахты. Расце добрабыт працоўных. Умацоўваецца абароназдольнасць нашай радзімы. Аснашчоная перадавой тэхнікай, чырвоная Армія зорка ахоўвае нашу творчую працу.

XVIII Усесаюзная партыйная канферэнцыя, зыходзячы з штарэсаў совецкага народа, намецела грандыёзную праграму будаўніцтва. Для рэалізацыі яе патрэбны велізарныя сродкі. Адной з крыніц совецкага бюджэта з'яўляюцца пазыкі. Я заклікаю ўсіх рабочых нашага завода даць у пазыку дзяржаве трохтыднёвы заработак.

Гучнымі апладысментамі сустракаюць прысутныя яго прапанову. І у гэтым патоку рукаплясканняў чутна сіла совецкага народа, яго гатоўнасць аддаць усе свае сілы і здольнасці на росквіт радзімы.

Адзін за другім выступаюць рабочыя.

— Кожны з нас, — гаворыць рабочы Глабасюк, — сваімі вачыма можа пераканацца, куды ідуць совецкія пазыкі. Паглядзіце, як пераўтвараюцца вуліцы нашага горада. Вырастаюць клубы, бальніцы, пракладваецца водаправод. І ўсё гэта будуецца для народа. Давайце дружнай падпіскай па пазыку адкажам нашаму ўраду на яго клопаты аб совецкім народзе. Я першы падпісваюся на месячны аклад.

...Кароткімі былі выступленні рабочых Еўдасюк, Бік, Далган. Але ўсе яны прасякнуты гарачай любоўю да радзімы, да партыі, да ўрада.

— Я падпісваюся на месячны аклад, — гаворыць работніца Бік. — Няхай расце і мацнее наша радзіма!

— У азнаменаванне пастановы ўрада, — гавораць у сваёй рэзалюцыі рабочыя, — мы ўсё, як адзін, падпісваемся на Пазыку Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года) і бярэм на сябе абавязацельства выканаць поўгадовы промфінплан да 10 чэрвеня, знізіць сабекошт прадукцыі, не парушаць тэхналогію вытворчасці, павысіць прадукцыйнасць працы.

Пасля мітынга за гадзіну падпісалася 210 чалавек на агульную суму ў 45.985 рублёў. Большасць рабочых падпісваецца на трохтыднёвы і месячны заработак. Падпіска на заводзе працягваецца.

Г. Будай.

РАДАСЦЬ СОВЕЦКАГА НАСТАЎНІЦТВА

Бязмежную любоў да соцыялістычнай радзімы прадэманстравалі настаўнікі маладога совецкага горада Брэста. Як па вялікую ўрачыстасць, сабраліся яны 2-га чэрвеня ў прасторную залу пятай сярэдняй школы. Распачаўся мітынг. Сакратар партарганізацыі гарадскога аддзела народнай асветы тав. Шабека зрабіў паведамленне аб выпуску новай пазыкі:

— Сёння правадыром працоўных вялікага Совецкага Саюза таварышом Сталіным падпісана пастанова Совета Народных Камісараў СССР аб выпуску Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года). Выпуск пазыкі накіраван на далейшы росквіт нашай краіны, на ўмацаванне яе магутнасці.

Слова атрымаў работнік аддзела народнай асветы тав. Жэбет. Ён заявіў:

— Новая пазыка — гэта далейшае шчаслівае і радаснае жыццё працоўных нашай радзімы. Я падпісваюся на месячны заработак і заклікаю ўсіх настаўнікаў паследаваць майму прыкладу.

Таварыш Сізова на мітынгу паведаміла, што калектыў школы № 15 на працягу поўгадзіны падпісаўся на 3500 рублёў. Падпіска працягваецца.

Тав. Гайфрох (5 школа) у сваім выступленні гаворыць аб складанай міжнароднай абстаноўцы, аб неабходнасці ўмацоўваць абароназдольнасць бацькаўшчыны працоўных усяго свету — краіны Советаў.

Удзельнікі мітынга аднадушна прынялі рэзалюцыю, у якой выражаюць задавальненне і радасць па поваду выпуску пазыкі.

Пасля мітынга па калектывах разгарнулася дружная падпіска. Настаўнікі і гахвічны персанал школы № 2 за 15 мінут падпісаліся на 5935 рублёў. 90 процантаў усяго састава падпісаліся на месячны заработак. Дырэктар школы тав. Храмянкоў пры зарплаце ў 800 рублёў падпісаўся на 1000 рублёў.

Па школах горада на 9 гадзін вечара падпіска складала 46 тысяч рублёў.

Г. Паўнаў.

ЗАМАЦОЎВАЮЦЬ ПАДПІСКУ ЎВНОСАМІ

ВЫСОКАЕ, (па тэлефону). З велізарным натхненнем сутрэлі працоўныя горада і раёна пастанову СНК СССР аб выпуску новай пазыкі. Пасля таго як пастанова была перадана па радыё, да 10 гадзін вечара 2 чэрвеня сума падпіскі склала па гораду Высокае 143105 рублёў і раёну—24015 рублёў.

Добра разгарнулі падпіску у Баршчэўскім сельсавеце, дзе старшынёй працуе т. Петручык Тацьяна Сяпанаўна. Ёй дапамагае камандыраваны з раёна т. Варановіч. Тут к 10 гадзінам рашцы 3-га чэрвеня афармілі падпіску 47 чалавек на 5400 руб. і ўнеслі паўнымі 1200 руб.

Трынаццаць калгаснікаў калгаса «Іскра Ільіча» падпісаліся на 1050 рублёў і унеслі паўнымі 400 рублёў. Кузміцкі П.Л. і Мапчак В. падпісаліся на 100 руб. кожны і ўнеслі адразу па 50 руб.

Адпаасобнік-бядняк вёскі Хоцінава Кузміцкі Ануфрэй падпісаўся на 150 рублёў і поўнасцю ўнёс гэтую суму. Яго прыкладу паследавалі Ткачук Трафім і Гук Д.М. — падпісаліся на 100 рублёў кожны і тут-жа ўнеслі грошы поўнасцю.

Рабцаў.

Умацуем абароназдольнасць краіны.

Рабочыя і служачыя арцелі «Чырвоны металіст» гор. Брэста сустрэлі пастанову Совета Народных Камісараў СССР аб выпуску новай пазыкі з вялікай радасцю. Кожны разумеў, што новая пазыка яшчэ больш умацуе абароназдольнасць краіны. 2 чэрвеня да 7 гадзін 15 мінут падпісалася 64 чалавекі на суму 14775 рублёў. Падпіска працягваецца.

Сакалінскі, Квяткоўскі.

Па ўмацаванне магутнасці соцыялістычнай дзяржавы

Шостая гадзіна вечара. У сталовай Брэсцкай арцелі «Шлях соцыялізма» пасля змены сабраліся члены арцелі. З выключнай увагай рабочыя і служачыя слухаюць перадачу па радыё: «Увага! Слухайце... Перадаем Пастанову Совета Народных Камісараў Саюза ССР аб выпуску дзяржаўнай Пазыкі Трэцяй Пяцігодкі (выпуск чацвертага года)».

Як толькі закончылася перадача пастановы ўрада аб выпуску новай пазыкі, адбыўся кароткі мітынг. Яго адкрыў старшыня арцелі тав. Карпук. Расказаўшы аб значэнні пазык, выпускаемых у соцыялістычнай краіне, прамоўца заклікаў усіх прысутных па мітынгу падпісацца на пазыку.

Першай у спрэчках выступіла маладая работніца тав. Левінская.

— Новая пазыка — гэта багаты ўклад нашай радзіме. У капіталістычных краінах сродкі ад пазык ідуць на вайну. Нашы пазыкі ў корані адрозніваюцца ад тых пазык, якія выпускаюцца за мяжой. У краіне Советаў сродкі ад пазык ідуць на палепшэнне добрабыту працоўных, на ўмацаванне магутнасці нашай краіны. Пагэтаму мы з радасцю аддадзім у пазыку дзяржаве свае зберажэнні.

— Таварышы, мы ўсе добра ведаем, што сродкі, атрыманыя ўрадам ад пазык, — гаворыць у сваім выступленні тав. Ферман, — ідуць на ўмацаванне магутнасці нашай вялікай дзяржавы. Яны садзейнічаюць палепшэнню добрабыту працоўных мас, забяспечваюць нам шчаслівае жыццё, умацоўваюць нашу абарону.

Зараз мы з вамі жывём у шчаслівую сталінскую эпоху, з'яўляемся роўнапраўнымі грамадзянамі. Аб нас пястомна клапоцяцца партыя і ўрад. У капіталістычных-жа краінах прапоўныя масы асуджаны на голад. Яшчэ зусім нядаўна мы з вамі на сваіх плячах перанеслі ўсе жахі капіталістычнай эксплуатацыі. Цяпер мы вольныя грамадзяне.

Совецкая краіна, у якой мы жывем, праводзіла і праводзіць мудрую сталінскую палітыку міру. Але мы не павінны забываць, што наша соцыялістычная дзяржава працягвае заставацца ў капіталістычным акружэнні. Пагэтаму мы павінны штодзённа ўмацоўваць магутнасць Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Новая пазыка яшчэ больш умацуе абароназдольнасць нашай радзімы.

Пасля мітынга пачалася падпіска. За гадзіну падпіска склала 15.675 рублёў (падпісалася 117 чалавек).

А. Кацуба.

З радасцю падпісваюцца на пазыку

Абслугоўваючы персанал рамесленага вучылішча № 6 горада Брэста дружна і арганізавана адгукнуўся на выпуск пазыкі Трэцяй пяцігодкі (выпуск чацвертага года). 55 чалавек падпісаліся на суму 19525 рублёў, што складае 91,2 процанта да месячнага фонда зарплаты. Большасць работнікаў падпісалася на месячны аклад.

Іспыты ў Рагачоўскай сярэдняй школе № 4 (Гомельская абласць).

НА ЗДЫМКУ: у час перапынку. На першым плане — павучаючыяся 8 класа Б. Шаўскі, Т. Кузнецова, Е. Барташэвіч і І. Полавец віншуюць друг друга са здачай іспытаў па фізіцы на «выдатна». Фота І. Соркіна (БЕЛТА).

Добрыя вынікі

Жыццё школы на працягу ўсяго года красамоўна і змястоўна. Але час веснавых трэнажорных і выпускных іспытаў яшчэ больш ажывіў школу, увесь вучнёўскі і настаўніцкі калектыў. Цяпер падводзяцца вынікі гадавой працы. З якімі поспехамі, водзмі, ажыццёўленнямі мы прышлі да канца навучальнага года?

На працягу ўсяго навучальнага года настаўніцкі калектыў і вучні змагаліся за першынства, за поўнае выкананне праграмы і лепшыя паказчыкі ў паспяховасці. Не гледзячы на тое, што ў нашай школе выкладанне на беларускай мове вядзецца першы год, маюцца нядрэнныя вынікі. Гэта відаць па ходу іспытаў. Настаўнікі добрасумленна перадавалі свае веды вучням, змаглі зацікавіць іх, арганізавалі на добрасумленную работу, прывіцці любоў да прахадзімых прадметаў, паставілі на належную вышыню соцнаборніцтва. Вялікую дапамогу школе аказвалі бацькі, з якімі настаўніцкі калектыў трымаў цесную сувязь.

Падрыхтоўка да іспытаў яшчэ больш натуляла настаўнікаў і вучняў на лепшую працу. Настаўнікі ўзмоцнена правялі заняткі з адстаючымі, былі заўсёды гатовы вучняў, каб вывучыць іх усебакова, своечасова аказваць ім належную дапамогу.

На час іспытаў для вучняў створаны добрыя ўмовы, сістэматычна праводзяцца кансультацыі па ўсіх дысцыплінах. Ва ўсім пагляданецца чоткасць, акуратная яўка настаўнікаў і вучняў у школу. На кансультацыях вучні праяўляюць вялікую актыўнасць, задаюць шмат пытанняў.

У школе створаны спецыяльныя пакоі з абсталяваннем і наглядным дапаможнікамі. Абсталёван пакой па геаграфіі і канструктуцы, дзе развешаны геаграфічныя карты, схемы, графікі, ёсць глобусы і інш. У пакоі фізікі і хіміі расстаўлены розныя прэпараты. Вучні самі нарысавалі некаторыя схемы, карты, малюнкі па анатоміі, фізіялогіі, хіміі.

Ліквідуючы вялікае значэнне сувязі з бацькамі, перад іспытамі праведзен бацькоўскі сход, дзе ставілася пытанне аб іспытах, неабходнасці стварэння добрых умоў на час іспытаў.

Цікавы час іспытаў. Вырашаецца лёс вучняў. Вучні маюць радасны, бадзёры настрой. Яны задаволены гэтым часам іспытаў і рады паказаць свае веды, праверыць сваю моц па прахадзімых прадметах.

А радавацца ёсць чаму. Першыя дні іспытаў паказалі добрыя вынікі. Вучні давалі самыя вычарпальныя адказы на пастаўленыя пытанні.

Вучні 7 і 8 класаў усе напісалі пісьмовыя работы па беларускай мове на «добра» і «выдатна». Такія-ж рэзультаты атрыманы па рускай мове і алгебры ў гэтых класах. Асабліва добрыя і вычарпальныя адказы давалі вучні 8 класа па беларускай літаратуры. Вучні Гарбуленка Рая, Градзенская Эстара, Стэльмакова К., Саўчук Л. на ўсе пастаўленыя пытанні змястоўна адказалі, і камісія без дадатковых пытанняў ацаніла іх адказы на «выдатна».

Расце лік выдатнікаў і ўдарнікаў вучобы. Ёсць рад вучняў, якія даюць толькі добрыя і выдатныя адказы, як вучань IV класа Якімюк, V класа—Рудзеўская, Ліпцынскі, Чурак, Данілюк, VI класа—Сікора, Палешук, Маргелова, Пратасевіч, Стронская, VII класа — Васілюк Лідзія, Вражціонка, Цвікальская.

Цікава прайшлі вусныя іспыты па фізіцы ў 8 класе. Свае адказы вучні падмацоўвалі графічнай адзнакай па дошцы, паказвалі на прыладах і прыборах, прыводзілі рад прыкладаў з навакольнага, штодзённага жыцця. З задавальненнем усе прысутныя праслухалі змястоўны адказ вучаніцы Стэльмаковай аб кінетычнай энергіі, першым законе Ньютона, роўнамерна-пераменным руху і і другіх пытаннях.

Дасягнутыя поспехі абавязваюць як настаўніцкі калектыў, так і вучняў яшчэ лепш, з большай энергіяй і ўпартасцю змагацца за веды, за культуру працы ў будучым, за выдатнае правядзенне іспытаў.

Справа часці ўсяго калектыва школы заваяваць першае месца па паспяховасці ў раёне.

Н. Рудзько,
дырэктар першай Гайнаўскай сярэдняй школы.

Пачалася праполка азімых

На палях калгасаў Сямяніцкага раёна з'явіліся дружныя і роўныя ўсходы яравых культур. Асабліва добра растуць лён, цукровыя буракі, ячмень і авёс. Пасля праведзенай падкорчкі мінеральнымі ўгнаеннямі хутка пайшлі ў рост азімыя пасевы.

Калгаснікі калгасаў раёна арганізавалі клапатлівы і старанны догляд пасеваў зернавых культур. На калгасных палях разгарнуліся праполачныя работы. У калгасе імені Сталіна праведзена праполка азімай пшаніцы на плошчы трох гектараў. На праполачных работах працуюць спецыяльна створаныя звенні.

Прыступілі да праполкі пасеваў і ў іншых калгасах раёна.

І. Палеўчэнка.

* * *

Закончыўшы веснавую сяўбу, калгасы Кобрынскага раёна з кожным днём усё шырэй разгортваюць праполачныя работы. У калгасе імені Варашылава ўжо праполата паўтара гектара азімай пшаніцы. Разам з правядзеннем праполкі пасева калгаснікі прыступілі да ворыва папару.

Бобрык.

ВЫКАНАЛІ ПОЎГАДОВЫ ВЫТВОРЧЫ ПЛАН

Заклік днепрадзяржынцаў аб разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва за датэрміновае выкананне поўгадовага вытворчага плана знайшоў жывы водгук і адпаведнае адабрэнне калектыва рабочых і служачых грудкаўскага лесазавода імені Чапаева, Гайнаўскага раёна. Падтрымліваючы гэты выдатны пачын, рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі лесазавода дэталёва падлічылі свае магчымасці і абавязаліся выканаць поўгадовы вытворчы план да 11 чэрвеня і распілаваць 12 тысяч кубаметраў лесаматэрыялу звыш поўгадовага плана.

Разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва, рабочыя сталі лепш працаваць і значна ўзнялі прадукцыйнасць працы. У апошнія дні выдатныя паказчыкі мае трэцяя піларама, на якой працуюць змешаныя рамшчыкі Купт і Разумоўскі. Яны выконваюць дзённы план на 150 процантаў.

Высокіх паказчыкаў у сваёй рабоце дабіліся рабочыя піларам, якімі кіруюць рамшчыкі Асташэўскі і Марцінкевіч. Яны выкошваюць свае планы на 130 процантаў.

З рамшчыкамі спаборнічаюць сартыроўшчыкі, грузчыкі і адвозчыкі. Узоры стахановскай работы паказваюць сартыроўшчыкі Анна Алексеюк і Анна Іванюк. Свой план яны штодзённа выконваюць не менш як на 148 процантаў. Сістэматычна выконваюць вытворчыя заданні на 150 — 170 процантаў грузчык Медзяк Раман і адвозчык Адамчык.

На заводзе падведзены папярэднія вынікі агульнаазаводскага соцыялістычнага спаборніцтва. У чапаеўцаў словы не разыйшліся са справамі. Па становішчу на 31 мая завод першым у раёне датэрмінова выканаў поўгадовы вытворчы план.

Ф. Кавалёў.

Добра арганізаваны улік выпрацаваных працадзён калгаснікамі ў сельскагаспадарчай арцелі імені Кагановіча Пінскага раёна (Пінская абласць). Штодзённа рахункавод калгаса І. Л. Посеніцкі паведамляе калгаснікам, колькі ў іх улічана працадзён.

НА ЗДЫМКУ: Тав. Посеніцкі (справа) дае даведку аб выпрацоўцы за тыдзень калгаснику вартаўніку А. Н. Пташкіну. Фота В. Лупейкі. (БЕЛТА).

Пакуль надумаюць і лета пройдзе

Чэрвень. Наступіла гарачая летняя пара. З кожным днём усё вышэй падымаецца сонца, яго прамені шчодра абаграваюць зямлю. У такі дні, у вольны ад работы час, нікога не ўтрымаеш у душным пакоі. Кожны імкнецца па свежае паветра, пасля працоўнага дня, кожны шукае, дзе-б найбольш добра, культурна і зручна выкарыстаць час адпачынку.

Ці можна сказаць, што ў Брэсце створаны ўсе умовы для поўнацэннага адпачынку? На жаль гэтага сказаць нельга. Каб не быць галаслоўнымі, падмацуем сваё сцвярджэнне канкрэтнымі фактамі.

Самымі лепшымі месцамі, дзе працоўныя любяць праводзіць свой вольны час, з'яўляюцца паркі культуры і адпачынку. Есць такія паркі і ў Брэсце. Як-жа яны адпавядаюць свайму прызначэнню?

Адзін з іх — гаралскі парк 1 мая — вось ужо больш 20 дзён адкрыт для наведвальнікаў. У ім ёсць ўсё для таго, каб стварыць добрыя ўмовы для культурнага адпачынку працоўных. Цвістыя алеі даюць магчымасць схавацца ад дзённай спякоты, мноства дрэў, трава, кветкі — усё гэта захоўвае свежасць паветра. Тэрыторыя парка дазваляе таксама абсталяваць пляцоўкі для розных гульняў і атракцыёнаў, арганізаваць рад увесяліцельных мерапрыемстваў.

Усе гэтыя магчымасці, пакуль што, у парку не скарыстоўваюцца. Становішча яго гаворыць аб тым, што належнай падрыхтоўкі да летняга сезона не было праведзена. Танцавальная пляцоўка, стралковы цір, ды вельмі рэдкія эстрадныя канцэрты—вось усё, чым могуць парадавацца наведвальнікі.

Толькі зараз у парку пачалі абсталёўваць эстрадную пляцоўку. У чаканні, пакуль будуць зроблены скамейкі, наведвальнікі вымушаны слухаць канцэрты стоячы. У парку ёсць магчымасці адкрыць добры тэнісны корт, але да абсталявання яго яшчэ і не думалі прыступаць. Нічога не робіцца па стварэнню пляцовак для розных другіх гульняў. А можна-ж без асаблівых цяжкасцей абсталяваць, баскетбольную, валейбольную пляцоўкі, месца для гульні ў гарадкі і інш. Пры невялікіх затратах можна набыць і ўстанавіць у парку атракцыёны.

У парку не арганізаван як належыць і танцаль. Тут, акрамя кафэ «Лето», у розных пунктах ёсць прадуктовыя ларкі. Але ў іх вельмі абмежаваны асартымент прадуктаў. Газіраваная вада, пернікі і папяросы — вось усё, што можна набыць у ларках.

Колькасць кінатэатраў бесперапынна расце. Існуючыя ў горадзе кінатэатры яўна не задальняюць патрэб насельніцтва. Ды не ўсякаму ахвота летам на працягу двух гадзін сядзець у душнай зале, прыстасаванай да зімовых умоў. Даўно паспела неабходнасць стварэння ў Брэсце летняга кінатэатра.

Аб будаўніцтве такога тэатра ў парку ім. 1 мая ўжо другое лета ідуць нескончаемыя размовы. І толькі зараз абласное ўпраўленне кінофікацыі думае прыступіць да будаўніцтва тэатра. Трэба ім сказаць: «Хутчэй думайце, таварышы, а то, таго і глядзі і лета пройдзе!»

Крыху аб парку, які знаходзіцца на рагу праспекта ім. 17 верасня і Маскоўскай вуліцы. Хто з жыхароў Брэста не ведае гэтага жывапіснага, утульнага куточка? Па свайму характару, багацтву расліннасці, паяўнасці прыродных ландшафтаў гэты парк мае многа перавагі у параўнанні з паркам ім. 1 мая.

І вось гэта выдатнае для адпачынку месца да апошняга часу ню выкарыстоўвалася па свайму прызначэнню. Толькі днямі вароты парка адкрыліся. Але адкрыць вароты недастаткова. Да выдатных прыродных умоў парка трэба дадаць усё неабходнае для культурнага, поўнацэннага адпачынку. Трэба хутчэй адпаведна абсталяваць яго. Робіцца-ж гэта вельмі павольна. Нават горш. Яшчэ не вырашана пытанне, у чыім веданні будзе знаходзіцца парк. А пакуль ідуць размовы аб гэтым, у парку знішчаюцца заялёныя насаджэнні: дрэвы, кветкі.

Любімым месцам адпачынку жыхароў Брэста з'яўляецца набережная ракі Мухавец. Туды штодзённа прыходзяць сотні людзей. Мясцовым кіраўнікам трэба было-б праявіць клопаты ў справе стварэння максімальных выгод для адпачынку працоўных. Як выглядзіць набережная з гэтага пункту гледжання? Можна адказаць коратка: вельмі непрыгледна. Тут не створана нават мінімум выгод. З-за адсутнасці скамеек наводвальнікі вымушаны сядзець на перакладзінах загарадзі службовых пабудоў спартыўных таварыстваў. Гора вам, калі вы прышлі на набережную без запасу піццявой вады, асабліва ў жаркае надвор'е. Піццявой вады, апрача рачной, непрыгоднай для піцця, вы тут не знойдзеце. Наогул ніякага гандлю на набережнай няма нават у зародышы.

З кожным днём па рацэ становіцца ўсё больш купаючыхся. Абсталяванне-ж пляжа яшчэ не пачыналася. Не адведзены месцы, дазволеныя для купання, не ўказана глыбіня ракі ў розных месцах. Другіх выгод для купаючыхся таксама няма.

Зараз па ўсёй нашай рэспубліцы, ў тым ліку і ў Брэсце, разгарнуўся выдатны рух за культуру гарадоў, сёл і вёсак. Трэба прыняць неабходныя меры і стварыць для працоўных горада ўсе ўмовы для поўнацэннага культурнага адпачынку.

Я. Нілін.

Злучка конематак праходзіць нездавальняюча

На 20 мая па абласці план злучкі конематак выкананы толькі на 11,7 процанта. Што датычыцца таніх раёнаў, як Косаўскі, Камянецкі, Дывінскі, Высокаўскі і іншыя, то тут гэта кампанія пад пагрозай зрыву. У Косаўскім раёне план злучкі выкананы на 12,6 процанта, у Камянецкім — 6,7, Кобрынскім — 7,8, Кляшчэльскім — 8,5, Бярозаўскім—9,9 процанта.

Пры праверцы ходу злучкі ў Высокаўскім, Сямяніцкім, Бярозаўскім, Антопальскім, Жабінкаўскім, раёнах устаноўлена, што і працягу больш двух месяцаў выканкомы райсоветаў гэтых раёнаў нават не ставілі пытання аб ходзе злучкі, не намецілі мерапрыемстваў па палепшанню правядзення злучкі кампаніі гэтага года. Не аказана ў гэтым адпаведная дапамога сельсоветам.

Да гэтага часу ў асобных раёнах не праверана работа злучных пунктаў, не праверены жарабцы-вытворнікі на якасць спермы, а ветурачы Сямяніцкага раёна Табін і Варанцоў і Жабінкаўскага раёна Гаменюк памылкова лічаць, што гэтай справай яны паогул не павінны займацца. Загадчыкам злучных пунктаў не растлумачана, якія нормы кармоў павінен атрымоўваць племянны жарабец, як наладзіць догляд за ім.

Вялікая ўвага надаецца справе мятызацыі конематак племяннымі вытворнікамі. Пагэтаму ў вясенні перыяд праводзяць кастрацыю непрыгодных да злучкі, выбракаваных жарабкоў. Гэта работа ў асобных раёнах, як Сямяніцкім, Жабінкаўскім, не праводзіцца, а начальнік ветупраўлення абласа Кузнецоў лічыць, што кастрацыю можна праводзіць у жніўні месяцы, у гарачую пару года, або восенню, калі гэтыя непародныя вытворнікі на пасбішчах будуць пакрываць конематак. Такая няправільная пастаноўка пытання ветупраўленнем абласці заслугоўвае сур'ёзнай увагі з боку аблса.

У многіх месцах, дзе справе аднаўлення конскага пагалоўя надаюць многа ўвагі, злучная кампанія праходзіць добра. Вось калгас «Победа», Высокаўскага раёна. У гэтым калгасе загадчык конетаварнай фермы тав. Грыцюк і заатэхнік падабралі конематак для злучкі па пародзе і тыпу. На 15 мая тут было злучана ўжо 25 конематак. Проба конематак праводзіцца штодзённа зранку да выезду на работу.

Трэба адзначыць, што не ва ўсіх калгасах вядуцца злучныя рэестры. На гэта павінен звярнуць увагу зоаветпересанал раёна. Зоаветработнікі раёнаў павінны аказаць практычную дапамогу загадчыкам злучных пунктаў у тэхніцы правядзення злучкі, бо ёсць цэлы рад выпадкаў няправільнага правядзення злучкі.

Ход злучкі конематак неабходна абмеркаваць у кожным сельсавеце на пасяджэннях выканкомаў сельскіх сонстаў, правесці агульныя сходы сялян, растлумачыўшы значэнне злучкі конематак, намецінь мерапрыемствы, якія забяспечаць выкананне даведзенага плану злучкі.

Дзеянцаў,
заатэхнік абласнога земельнага аддзела.

Царква і другая імперыялістычная вайна

З пачаткам другой імперыялістычнай вайны духавенства і рэлігійныя арганізацыі кожнай ваюючай краіны сталі на старону сваёй буржуазіі і благаславілі яе дзеі. Паўтарылася тое, што было ў гады першай імперыялістычнай вайны, калі ў кожнай ваюючай краіне папы апраўдвалі сваю буржуазію і дапамагалі ёй абманваць масы адносна мэт і характару вайны, дапамагалі ёй гнаць народ на бойню за варожыя яму інтарэсы.

З першых дзён другой імперыялістычнай вайны глава англійскай царквы, архіепіскап Кентэрберыйскі, у сваіх выступленнях у друку, па радыё, у пропаведзях заяўляў, што Англія вядзе вайну «бескарыслівa», за «справу цывілізацыі», за «справядлівасць», за «таварыства хрысціянства». У адозве да англійскіх грамадзян, якая паявілася 15 верасня 1939 года за подпісам кіраўнікоў англійскай і шатландскай царквоў, было сказана, што вайна Англіі «навязана», што непрыяцеля «патрэбна зламаць, ужыўшы супроць яго сілу», хоць гэта і агідна хрысціянскаму сазнанню.

У такім-жа духу выступалі прадстаўнікі іншых царквоў Англіі: глава каталіцкай царквы кардынал Хінслей, глава іудзейскай царквы равін Герц і іншыя.

Прадстаўнікі розных царквоў Францыі таксама запэўнялі, што Францыя ўступіла ў вайну для «абароны цывілізацыі», «справядлівасці» і «рэлігіі».

Не драмала духавенства і ў другім лагеры ваюючых дзяржаў. Яно паспяшыла прысці на дапамогу сваёй буржуазіі, каб апраўдаць вайну. У ліпені 1940 года два італьянскія епіскапы ў звароце да веруючых заявілі нават, што Італія вае за вызваленне гроба гасподня».

* * *

Буржуазія кроўна зацікаўлена ў тым, каб скрыць ад народных мас імперыялістычны, грабежніцкі характар цяперашняй вайны.

Ва ўсіх ваюючых краінах пануючыя класы цвердзяць, што яны вядуць вайну толькі за справядлівасць, за права свайго народа, за тое, каб адваяваць для яго жыццёва-неабходнае. Царква дапамагае буржуазіі скрываць ад народных мас сапраўдныя мэты вайны, яна дае маральнае і рэлігійнае апраўданне вайны.

Папы кожнай ваюючай краіны сцвярджаюць, што вайна «навязана» дапай дзяржаве праціўнікам: мы, маў, вайны не хацелі, нам яе навязалі, а таму трэба ваяваць.

Народныя масы хочуць ведаць, у чым крыюцца прычыны вайны. Ёсць адзін правільны адказ на пытанне аб прыродзе імперыялістычных войн. Аб прычынах войн пры імперыялізме Ленін у 1914 годзе пісаў.

«Вайна не выпадковасць, не «грэх», як думаюць хрысціянскія папы (прапаведуючыя патрыятызм, гуманнасць і мір не горш за апартуністаў), а неміпучая ступень капіталізма, такая-ж законная форма капіталістычнага жыцця, як і мір» (Ленін, т. XVIII, стар. 70).

Царква дапамагае правячым класам скрываць ад працоўных праўду аб імперыялістычнай вайне. Духавенства дае сваё «аб'яснение» вайне. Вайна, гаворыць папы, — «кара божая» за грахі, бог церпіць «грахоўныя дзеянні» людзей да пары да часу, а калі выходзіць з цярпення, то карае чалавецтва вайной.

Асабліва многа ў гэтым духу выступае папа рымскі. Прычына вайны ў тым, пісаў ён у пасланні ад 20 кастрычніка 1939 года, што людзі забылі бога і заняліся чыста зямнымі справамі. У прамове ў вялікдзень мінулага года папа заявіў, што прычына вайны — «гордасць, узняўшаяся супроць бога...»

Але калі вайна — «кара божая», гэта значыць ідзе ад бога, то лагічна атрымліваецца, што ў гэтай вайне бог вінен больш за ўсіх. Папы і гатовы прыпісаць богу віну за вайну, толькі-б выгарадзіць і рэабілітаваць свайго сапраўднага гаспадара — імперыялістычную буржуазію і зняць з яго, свайго гаспадара, адказнасць за вайну.

Царква ў краінах ваюючых лагераў выпрацоўвала сваю дзейнасць патрэбам вайны. Служыцелі царквы вядуць ваенную прапаганду, якая поўнасцю супадае з планамі ўлад і камандавання, ці выражаецца гэта ў дзейнасці добрачынных устаноў, ці ў рабоце сярод жонак і маці сярэй салдат, у царкоўных пропаведзях, або ў службе ваенных папоў (у ваюючых арміях ёсць ваеннае духавенства).

Для імперыялізма характэрэн крайні нацыяналізм ва ўсіх сферах — у эканамічнай, палітычнай, культурнай. Нацыяналізмам насычаны і ўсе рэлігіі. Хрысціянская царква ў адной краіне моліць бога аб тым, каб ён абрушыўся на народы другой краіны, а ў той другой краіне хрысціянскія папы ў сваю чаргу моляць госпада бога аб перамозе для свайго войска і шлюць праклёны на адрасу праціўніка.

Як бачым, палітыка царквы ў час вайны ёсць прадаўжэнне яе палітыкі ў мірны час. А яна, гэта палітыка, заўсёды зводзілася да таго, каб служыць буржуазіі, эксплаататарам.

* * *

Як вядома, імперыялісты на працягу многіх год да вайны ўзмоцнена працавалі ў тым напрамку, каб распаліць вайну супроць СССР. На XVIII з'ездзе партыі таварыш Сталін выкрыў палітыку буйных імперыялістычных дзяржаў, якія стараліся натакваць Германію супроць СССР, «штурхаючы немцаў далей на ўсход, абяцаючы ім лёгкую здабычу і прыгаварваючы: вы толькі пачніце вайну з большавікамі, а далей усё пойдзе добра».

Да ліку рэакцыйных сіл, якія ўсякімі спосабамі дабіваліся, каб вайна была накіравана супроць СССР, належыць і царква. Сваім антысавецкім цкаваннем папы стараліся стварыць атмасферу варожасці да СССР. Яны сеялі хлуслівыя чуткі і небыліцы аб нашай краіне, стараліся штурхаць палітычных дзеячоў буржуазіі на антысавецкія дзеянні.

Як і рэакцыйная буржуазія Англіі, Францыі і іншых краін, папы скарысталі вайну ў Фінляндыі, каб арганізаваць кампанію супроць СССР. Князі царквы на чале з рымскім папай збіралі нават грошы ў карысць белафінаў. У 1939 годзе, калі пасля распаду панскай Польшчы Совецкі Саюз падаў руку брацкай дапамогі працоўным заходніх абласцей Украіны і Беларусі, духавенства падняло шалёнае антысавецкае выццё.

Рэакцыйная папоўшчына з трывогай глядзіць на ўзмацненне СССР. Князі царквы і зараз яшчэ выношваюць мары аб тым, каб павярнуць вайну супроць СССР. У першую чаргу гэта адносіцца да главы каталіцкай царквы — рымскага папы. Антысавецкая палітыка папства пачалася з першых-жа дзён Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Яна з асаблівай сілай вядзецца цяпер, у дні другой сусветнай імперыялістычнай вайны.

Вайна прывяла ў буржуазных краінах да небывалага росту рэакцыі. Імперыялістычная буржуазія ўзмацняе тэрор супроць комуністаў, супроць людзей, якія часна і да канца адстойваюць інтарэсы народных мас і выкрываюць грабежніцкі характар вайны. Князі царквы таксама бяцца ўзмацнення ўплыву комунізма, яны апасаюцца, што ў ходзе вайны прапоўныя парэшце зразумеюць, хто сапраўдныя віноўнікі іх пакут. Царква баіцца рэволюцыянізіравання мас. Імецца па гэтых прычынах папы віталі ўстанаўленне рэжыма Петэна ў Францыі. У яго асобе яны бачылі і бачаць ратунак ад рэволюцыі.

Чым далей зацягваецца вайна, тым з большай трывогай пытаюць у сябе князі царквы: чым-жа яна - кончыцца? Яны больш за ўсё баяцца народнага гневу. Падобна буржуазіі, папы гатовы зараз многае абяцаць народам. Яны абяцаюць ім усё шчасце жыцця, але.... пасля вайны.

У канцы снежня 1940 года вышэйшыя іерархі англійскіх царквоў — англіканскай, пратэстанцкай і каталіцкай— апублікавалі ў газетах сумесную прапанову аб «новых парадках»... вядома, пасля вайны. Тут і абяцанне скасавання «абураючай пяроўнасці ў размеркаванні багацтваў», сентэнцыі аб тым, што ўсе дзеці павінны мець аднолькавыя магчымасці атрымаць асвету, і многае іншае. Але ўсё гэта — пасля вайны, а пакуль... пакуль трэба ваяваць.

М. ШУЛЬГІН.

180 75.

АБ АБАВЯЗКОВЫМ АКЛАДНЫМ СТРАХАВАННІ

РАШЭННЕ ВЫКАНКОМА БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АД 31 МАЯ 1941 ГОДА

На аснове закона аб абавязковым акладным страхаванні, прынятага Вярхоўным Советам Саюза ССР ад 4 красавіка 1940 года і ў адпаведнасці з пастановамі Совета Народных Камісараў Саюза ССР ад 12 красавіка 1941 г. за № 871 і Совета Народных Камісараў БССР ад 17 мая 1941 г. за № 589, выканком абласнога Совета дэпутатаў працоўных рашыў:

Абавязковае акладное страхаванне ў сельскіх і гарадскіх мясцовасцях Брэсцкай вобласці праводзіць з 1-га студзеня 1941 года на наступных умовах:

I. ЯКАЯ МАЁМАСЦЬ ПАДЛЯГАЕ СТРАХАВАННЮ

1. У калгасах абавязковаму акладнаму страхаванню падлягаюць:

а) будынкі, інвентар, абсталяванне, транспартныя сродкі, прадукцыя, сыравіна і матэрыялы;

б) пасевы сельскагаспадарчых культур (у тым ліку знаходзячыяся ў засадніках, парніках, цяплічах), пітомнікі і ўраджай садоў, ягаднікаў і вінаграднікаў.

в) коні ва ўзросце ад 1 года, а племянны маладняк коней ад 6 месяцаў, буйная рагатая жывёла, свінні, авечкі і козы ва ўзросце ад 6 месяцаў.

2. У гаспадарках грамадзян абавязковаму акладнаму страхаванню падлягае наступная маёмасць, якая належыць ім па праву асабістай уласнасці:

а) будынкі;

б) буйная рагатая жывёла ва ўзросце 6 месяцаў і коні ва ўзросце ад 1 года.

II. У ЯКІХ ВЫПАДКАХ ПАКРЫВАЮЦЦА ЎБЫТКІ

3. Пры страхаванні будынкаў, з ў калгасах, акрамя таго, інвентара, абсталявання, транспартных сродкаў, прадукцыі, сыравіны і матэрыялаў дзяржстрах пакрывае ўбыткі ад агню, удару маланкі, ўрыву (хаця б удар маланкі або ўрыву не папягнулі за сабой пажару), ад паводкі, бур, ураганаў, ліўняў, граду, абвалаў, апоўзняў.

Дзяржстрах пакрывае страхавацелям ўбыткі таксама ў тых выпадках, калі для спынення распаўсюджвання пажару або пры раптоўнай пагрозе паводкі была неабходнасць разбурыць пабудовы або перанесці іх на другое месца.

4. Пры страхаванні сельскагаспадарчых культур дзяржстрах пакрывае ўбыткі, якія ўзніклі ад градабіцця, ліўняў, бур, ад агню на корні, вымачкі, вымярзання, выпрання, замаразкаў і паводкі.

5. Пры страхаванні пасеваў табакі, махоркі, кок-сагыза, канатніка, валерыяны, мяты, кміну, шалфею, далмацкай рамашкі, змеягалоўніка, а таксама ўраджаю хмелю пакрываюцца ўбыткі, якія ўзніклі ад градабіцця, ліўняў, бур, ад агню на корні вымачак, вымярзання, замаразкаў, паводкаў і засухі.

6. Пры страхаванні жывёлы дзяржстрах пакрывае ўбыткі ад гібелі жывёлы, наследваўшай у выніку хваробы, старасці і няшчаснага выпадку.

Дзяржстрах таксама пакрывае ўбыткі ад вымушанага ўбою (прырэзкі) жывёлы:

а) калі ўбой зроблен па распараджэнню ветэрынарнага ўрача або ветэрынарнага фельчара ў сувязі з правядзеннем мерапрыемстваў па барацьбе з эпізоатыяй;

б) калі ўбой зроблен па распараджэнню ветэрынарнага ўрача, ветэрынарнага фельчара, а пры адсутнасці іх — па распараджэнню дэпутата выканкома сельсавета, калі з жывёлай здарыўся няшчасны выпадак і немінуча яе гібель;

д) калі ўбой зроблен па распараджэнню ветэрынарнага ўрача або ветэрынарнага фельчара ў выніку невылечнай хваробы, выключаючай магчымасці далейшага выкарыстання жывёлы.

III. У ЯКІХ СУМАХ ВЫПЛАЧВАЕЦЦА СТРАХАВОЕ ПАКРЫЦЦЁ

7. У выпадку гібелі ад агню і другіх стыхійных няшчасцяў (пункт 3) належачых калгасам будынкаў, інвентара, абсталявання, транспартных сродкаў, прадукцыі, сыравіны, матэрыялаў страхавое пакрыццё выплачваецца ў поўнай каштоўнасці маёмасці па інвентарнай ацэнцы, а будынкаў, належачых грамадзянам па праву асабістай уласнасці,—у поўным кошце будынкаў па страхавой ацэнцы (у гарадскіх мясцовасцях — па ацэнцы вызначаемай органамі Народнага Камісарыята Комунальнай гаспадаркі).

8. У выпадку гібелі сельскагаспадарчых культур у калгасах пакрыццё выплачваецца па наступных нормах:

Назва сельскагаспадарчых культур	Нормы у руб. на 1 гектар
Зернавыя, бабовыя, сеяныя травы (акрамя насеннікаў сеяных траў), сіласныя культуры, гарчыца і сланечнік-канатнік	60
Бульба, цукровыя буракі, кораніплоды, насеннікі кораніплодаў, лён-даўгунец, рапс, канопля, кок-сагыз, топінамбур і цыкорыя	200
Махорка, табак-бакун, насеннікі сеяных траў, мята, шалфей, кмін і далмацкая рамашка	250
Табак жоўты і сігарны	800
Гароднінныя культуры і насеннікі гэтых культур, валерыяна і змеягалоўнік	500
Ураджай садоў і ягаднікаў	700
Ураджай хмелю: першага года росту	500
другога года росту	1000
трэцяга года росту	2000
далейшых гадоў росту	3500
Расада табакі, капусты, таматаў і іншых культур, вінаградныя пітомнікі, пітомнікі плодовых насаджэнняў, хмелю і іншых культур.	10.000

9. У выпадку гібелі жывёлы страхавое пакрыццё выплачваецца па наступных нормах (у рублях за адну жывёлу):

Віды жывёлы	У калгасах	Гаспадаркам грамадзян (асабістай уласнасці)
Коні		
Ад 2 да 18 год	250	200
старэй 18 год	125	100
Ад 1 да 2 год, а належачыя калгасам племянныя коні — ад 6 месяцаў да 2 год	125	100
Буйная рагатая жывёла		
Ад 1 году і старэй	250	200
Ад 6 месяцаў да 1 году	125	100
Свінні		
Ад 6 месяцаў і старэй	80	—
Авечкі і козы		
Ад шасці месяцаў і старэй	60	—

Увага: Належачыя калгасам племянныя коні старэй двух год, а таксама племянная буйная рагатая жывёла, племянныя свінні і авечкі старэй аднаго году страхуюцца ў поўным кошце па страхавой ацэнцы.

10. Страхавое пакрыццё па нормах забеспячэння, указаных у гэтым рашэнні, выплачваецца за ўбыткі, якія мелі месца з 1-га студзеня 1941 года.

11. Страхавое пакрыццё выплачваецца ў поўнай суме страхавога забеспячэння толькі пры поўнай гібелі маёмасці; пры частковым пашкоджанні выплачваецца адпаведная частка сумы страхавога забеспячэння.

У выпадку гібелі жывёлы страхавое пакрыццё выплачваецца ў размеры нормы забеспячэння, але не вышэй сапраўднага кошту гэтых жывёл у здаровым становішчы.

IV. СТРАХАВЫЯ ПЛАЦЯЖЫ

12. Страхавыя плацяжы ўстаноўлены ў наступных размерах для ўсіх раёнаў вобласці:

а) па страхаванню маёмасці ад агню і другіх стыхійных бедстваў:

Аб'екты страхавання	Стаўкі (тарыфы) страхавых плацяжоў са 100 руб страхавога забеспячэння: У калгасах	У гаспадарак калгаснікаў, рабочых, служачых і каап. кустароў	У гаспадарак аднаасобнікаў і другіх грамадзян
У сельскіх мясцовасцях:			
Будынкі, а ў калгасах, акрамя таго,— прадукцыя, сыравіна і матэрыялы	80 кап.	1 руб.	1 руб. 45 кап.
Інвентар, абсталяванне і транспартныя сродкі	30 кап.	—	—
У гарадах, гарадскіх і рабочых пасёлках:			
Будынкі, а ў калгасах, акрамя таго,— інвентар, абсталяванне, транспартныя сродкі, прадукцыя, сыравіна і матэрыялы	30 кап.	30 кап.	60 кап.

б) Па страхаванню жывёлы ў калгасах:

Віды жывёлы	Стаўкі (тарыфы) са 100 руб. страхавога забеспячэння	Страхавыя плацяжы за адну жывёлу
Коні ва ўзросце ад 2 да 18 год	6 руб.	15 руб.
» старэй 18 год	6 руб.	7 руб. 50 кап.
Буйная рагатая жывёла ад 1 года і старэй	2 руб.	5 руб.
Свінні ад шасці месяцаў	4 руб.	3 руб. 20 кап.
Авечкі і козы ад 6 месяцаў	3 руб.	1 руб. 80 кап.

Увага: Па страхаванню належачай калгасам племянной жывёлы: коней ад 3 год і буйнай рагатай жывёлы, свіней і авечак старэй 1 году страхавыя плацяжы вылічваюцца па ўказаных вышэй тарыфных стаўках з сум страхавых ацэнак гэтай жывёлы.

У гаспадарках калгаснікаў, рабочых, служачых і кааперыраваных кустароў.

Буйная рагатая жывёла ад 1 года і старэй	3 рублі	6 руб.
Рабочых, служачых і кааперыраваных кустароў:		
коні ад 2 да 18 год	8 руб.	16 руб.
» старэй 18 год	8 руб.	8 руб.
У гаспадарках аднаасобнікаў:		
коні ад 2 да 18 год	8 руб.	16 руб.
« старэй 18 год	8 руб.	8 руб.
Буйная рагатая жывёла ад 1 года і старэй	4 руб. 70 кап.	9 руб. 40 кап.

в) Па страхаванню сельскагаспадарчых культур у калгасах:

Назвы сельскагаспадарчых культур	Стаўкі (тарыфы) з 100 руб. страхавога забеспячэння	Страхавыя плацяжы за 1 гектар
Азімыя пасевы, шматгадовыя сеяныя травы (акрамя насеннікаў гэтых траў)	4 руб. 75 кап.	2 руб. 85 кап.
Насеннікі шматгадовых траў	4 руб. 75 кап.	11 руб. 88 кап.
Яравыя пасевы зернавых, бабовых і сіласных культур, аднагадовыя сеяныя травы (акрамя насеннікаў гэтых траў), гарчыца і сланечнік	2 руб. 95 кап.	1 руб. 77 кап.
Насеннікі аднагадовых сеяных траў	2 руб. 95 кап.	7 руб. 38 кап.
Канатнік	8 руб.	4 руб. 80 кап.
Бульба, цукровыя буракі, кораніплоды, насеннікі кораніплодаў, лён-даўгунец, канопля, топінамбур і цыкорый.	2 руб. 95 кап.	5 руб. 90 кап.
Кок-сагыз	8 руб.	16 руб.
Махорка	6 руб.	15 руб.
Табак-бакун	7 руб.	17 руб. 50 кап.
Табак жоўты і сігарны	7 руб.	56 руб.
Мята, шалфей, кмін і далмацкая рамашка	8 руб.	20 руб.
Валерыяна і змеягалоўнік	8 руб.	40 руб.
Агародніна культуры і насеннікі гэтых культур	2 руб. 95 кап.	14 руб. 75 кап.
Ураджай садоў і ягаднікаў	2 руб. 95 кап.	20 руб. 65 кап.
Хмель: 1-га года росту	8 руб.	40 руб.
2-га года росту	8 руб.	80 руб.
3-га года росту	8 руб.	160 руб.
далейшых гадоў росту	8 руб.	280 руб.
Расада табакі, капусты, таматаў і другіх культур, пітомнікі плодовых насаджэнняў, хмелю і іншых культур	2 руб. 95 кап.	295 руб.

13. Плацяжы па страхаванню ў калгасах яравых і азімых пасеваў вылічваюцца па пасеўнаму плану, па страхаванню шматгадовых траў мінулых год па плану ўкосаў, а па страхаванню ўраджаю садоў, ягаднікаў і іншых насаджэнняў — па фактычнай плошчы.

Плошчы, засеяныя вышэй плана, страхуюцца бясплатна.

14. Плацяжы па абавязковаму акладнаму страхаванню вылічваюцца органамі дзяржстраху. Кожнаму страхавацелю ўручаецца пад распіску плацежнае паведамленне па форме, устаноўленай дзяржстрахам.

Плацяжы са страхавацеляў (акрамя калгасаў у сельскіх мясцовасцях) вылічваюцца падатковымі агентамі раённых фінансавых аддзелаў, а з калгасаў і страхавацеляў у гарадскіх мясцовасцях — органамі дзяржстраха.

15. У выпадку выяўлення скрытай або прапушчанай пры рэгістрацыі маёмасці, падлягаючай абавязковаму акладнаму страхаванню, страхавыя плацяжы ўзымаюцца за ўвесь час, па працягу якога маёмасць не была ўлічана, але не больш чым за два годы.

16. Рэгістрацыя маёмасці, падлягаючай абавязковаму акладнаму страхаванню, праводзіцца адзін раз у год. Страхавыя плацяжы вылічваюцца па маёмасці, улічанай пры гэтай рэгістрацыі. За маёмасць, паступіўшую ў гаспадарку страхавацеля пасля рэгістрацыі, страхавыя плацяжы ўзымаюцца толькі пасля правядзення наступнага чарговага ўліку маёмасці.

17. З сум страхавога пакрыцця ўтрымоўваюцца толькі страхавыя плацяжы і пядоімкі па іх.

18. Устанавіць наступныя тэрміны ўнясення плацяжоў па абавязковаму акладному страхаванню:

а) для калгасаў — 40 процантаў плацяжа да 15 верасня, 30 процантаў да 1-га лістапада і 30 процантаў да 1-га снежня кожнага года;

б) для калгаснікаў, рабочых, служачых, аднаасобных сялян і іншых грамадзян — 50 процантаў плацяжа да 15 верасня і 50 процантаў да 1-га лістапада кожнага года.

19. Страхавыя плацяжы, не ўнесеныя ў тэрмін, абарачваюцца ў пядоімку. На пядоімку налічваецца пеня за кожны дзень пратэрміноўкі ў наступных размерах:

З калгасаў . . . . . 0,05 проц.
З гаспадарак грамадзян 0,1 проц.

20. З агульнай сумы атрыманых плацяжоў па абавязковаму акладнаму страхаванню 15 процантаў адлічваецца на выдаткі па папярэджанню і барацьбе з пажарамі і падзяжом жывёлы.

21. Па правядзенне масавай работы па дзяржаўнаму страхаванню і прэміраванню страхавога актыва (грамадскіх страхавых інспектараў, членаў страхавых пастоў пры калгасах і інш.) устанавіць адлічэнні ў размеры 0,5 процанта ад паступіўшых плацяжоў па абавязковаму акладнаму страхаванню.

V. ІЛЬГОТЫ

22. У мэтах садзейнічання развіццю жывёлагадоўлі калгасам прадастаўляюцца наступныя ільготы:

а) па страхаванню племянной жывёлы — скідка са страхавога плацяжа ў размеры 20 процантаў;

б) па страхаванню жывёлы, якая знаходзіцца на таварных фермах, — скідка са страхавога плацяжа ў размеры 20 процантаў;

в) калгасам, перавыконваючым дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі і маючым лепшыя паказальнікі па ўтрымаццю жывёлы, — скідка з вылічанай сумы страхавых плацяжоў за страхаванне жывёлы ў размеры да 25 процантаў.

23. Калгасы, маючыя лепшыя паказальнікі па становішчу супрацьпажарнай аховы і будуючыя будынкі з агнетрывалымі крышамі (з чарапіцы, жалеза, шыфера і інш.), атрымліваюць скідкі з вылічанай сумы плацяжоў па страхаванню будынкаў, інвентара, абсталявання, транспартных сродкаў, прадукцыі, сыравіны і матэрыялаў у размеры да 50 процантаў.

24. Размер указаных у пунктах 22 і 23 гэтага рашэння скідак для асобных калгасаў устанаўліваецца рашэннямі выканаўчых камітэтаў раённых Советаў дэпутатаў працоўных па аснове акта агляду становішча застрахованай маёмасці ў калгасах.

25. Маладняк буйной рагатай жывёлы ва ўзросце ад 6 месяцаў да аднаго года і маладняк коней ва ўзросце ад аднаго года да двух год (а ў калгасах племянны маладняк коней ад 6 месяцаў да двух год) страхуецца без узымання страхавых плацяжоў.

26. Выканаўчыя камітэты раённых і гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных па прадстаўленню органаў дзяржстраха, могуць часткова або поўнасцю аслабяняць ад страхавых плацяжоў па абавязковаму акладнаму страхаванню асобныя гаспадаркі грамадзян.

27. Перасяленцы, а таксама калгасы, уноў арганізуемыя з перасяленцаў, або прымаючыя іх у свой састаў, аслабяняюцца ў месцах засялення ад уплаты страхавых плацяжоў у адпаведнасці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 17 лістапада 1937 года № 115/2043 «Аб ільготах па сельскагаспадарчаму перасяленню» (Збор. зак. СССР 1937 года № 73 арт. 352).

28. Па страхаванню неабагуленай маёмасці гаспадарак, уступіўшых у калгасы да 15 верасня гэтага года, страхавыя плацяжы вылічваюцца па стаўках (тарыфах), устаноўленых для гаспадарак калгаснікаў.

VI. АБАВЯЗКІ СТРАХАВАЦЕЛЯЎ

29. Калгасы і другія страхавацелі абавязаны ўтрымаць маёмасць і пасевы ў поўным парадку і ў строгай адпаведнасці з супрацьпажарнымі агранамічнымі і ветэрынарнымі правіламі, прымаць усе залежачыя ад іх меры да папярэджання пажараў, хвароб жывёлы і г. д.

30. Аб гібелі або пашкоджанні застрахаванай маёмасці ад стыхійных бедстваў страхавацель абавязан паведамляць: калгасы — сельскі совет і страхавога інспектара, калгаснікі і аднаасобнікі — сельскі совет. Гэтыя заявы абавязаны быць зроблены не пазней наступных тэрмінаў:

а) пры гібелі будынкаў і іншай маёмасці ад пажара, паводак і г. д., а таксама пры падзяжы жывёлы — не пазней адных сутак з дня стыхійнага бедства або няшчаснага выпадку;

б) пры гібелі або пашкоджанні сельскагаспадарчых культур — не пазней пяці сутак з дня, калі ўстаноўлена іх пашкоджанне або гібель.

Аб паступіўшых ад страхавацеляў заяў, акрамя заяў аб падзяжы жывёлы, сельскія советы абавязаны не пазней наступнага дня паведаміць у раённую страхавую інспекцыю.

VII. ПАРАДАК САСТАЎЛЕННЯ АКТАЎ АБ УБЫТКАХ

31. У выпадку падзяжа застрахованай жывёлы ў сельскіх месцах акты складаюцца: старшынёй выканаўчага камітэта сельскага Совета дэпутатаў працоўных або ўпаўнаважанымі ім дэпутатамі сельскага совета; у гарадскіх мясцовасцях— страхавымі інспектарамі або ветэрынарнымі ўрачамі.

Акты складаюцца пры абавязковым удзеле:

Пры ўбытку ў калгасах — старшыні праўлення або спецыяльна ўпаўнаважанага члена праўлення, а пры ўбытку ў гаспадарцы калгаснікаў або аднаасобнай гаспадарцы—главы гаспадаркі або поўнагадовага члена сям'і.

Акты складаюцца ў прысутнасці двух сведак.

32. У выпадку гібелі або пашкоджання будынкаў, інвентара, сельскагаспадарчых культур і іншай маёмасці акты складаюцца органамі дзяржстраха. Складанне актаў вытвараецца пры абавязковым удзеле страхавацеля, прадстаўніка сельскага совета і двух сведак, а пры гібелі сельскагаспадарчых культур — і пры ўдзеле агранома.

33. Дзяржстрах не пакрывае ўбыткі на ўсіх выпадках, калі гібель або пашкоджанне застрахаванай маёмасці адбылася па віне праўлення калгаса, а ў гаспадарках грамадзян — па віне страхавацеля або поўнагадовага члена яго сям'і.

34. Дзяржстрах мае права прад'явіць праз народны суд іск аб узысканні выплачанай сумы страхавога пакрыцця з асобы, вінаватай у гібелі або пашкоджанні застрахаванай маёмасці.

35. Дзяржстрах мае права адказаць у выплаце страхавога пакрыцця, калі страхавацель не паведаміў, маючы на гэта магчымасць, ва ўстаноўлены тэрмін (п. 30) аб гібелі або пашкоджанні за страхаванай маёмасці.

Старшыня выканаўчага камітэта абласнога Совета дэпутатаў працоўных.
ДЛУГАШЭЎСКІ.

Сакратар выканаўчага камітэта абласнога Совета дэпутатаў працоўных.
ВАЛЧКОЎ.

ЛАЎРЭАТЫ СТАЛІНСКАЯ ПРЭМІІ

Любімы пісьменнік совецкага народа

Наўрад ці хто-небудзь з пісьменнікаў атрымоўвае столькі пісем, колькі Шолахаў. Адны пішуць, каб выказаць захапленне яго творчасцю, другія раяць пісьменніку, як весці далей сваіх герояў, трэція просяць хутчай даць кнігі, якіх чакаюць з нецярпеннем.

Шолахаў — выдатны майстар совецкай літаратуры. Народ любіць свайго пісьменніка за глыбачайшую праўдзівасць, за большэвіцкую прынцыпіяльнасць і мужнасць, за незвычайную чуласць яго, як мастака і псіхолага, за тое як любоўна ён адлюстроўвае жыццё народа ў сваіх выдатных творах.

Пісьменнік Шолахаў абыходзіцца з матэрыялам жыцця не як пабочны назіральнік, — ён удзельнічае ў яго перадзелцы як партыйны і дзяржаўны дзеяч.

Пісьменніцкі шлях Міхаіла Шолахова не такі доўгі, але зроблена ім за параўнаўча кароткі тэрмін незвычайна многа.

Пісаць Шолахаў пачаў у 1923 годзе, восемнаццаці год ад роду. Свае першыя апавяданні друкаваў у комсамольскіх газетах і журналах. У 1925 годзе выйшаў першы зборнік, пад назвай «Данскія апавяданні». Пазней было надрукавана расшыранае выданне таго-ж зборніка пад назвай «Лазоравы стэп». У 1926 годзе пісьменнік пачаў работу над «Ціхім Донам». Першая, другая і трэцяя кнігі рамана выйшлі па працягу пяці год: з 1928 па 1933 год. Да 1933 года быў закончан і першы том «Паднятай цаліны», кнігі, паказваючай устанаўленне на Дану калгаснага ладу. Сёмая частка «Ціхага Дона» (першая палова чацвертай кнігі) была напісана ў 1938 годзе, а восьмая апошняя, к пачатку 1940 года.

Раман «Ціхі Дон» — велізарнага размаху эпічнае палатно, паказваючае жыццё Дона ў годы сусветнай і затым грамадзянскай вайны. Шолахаў паказвае, як абманчива была «цішыня» данскога жыцця, якія канфлікты і катастрофы пасягвалі ўнутры яе. Вайна прывяла ў дзеянне многія сілы. Цячэнні, якія варожа адносіліся адно да другога, прышлі ў сутычку. Ідэя саслоўнага адзінства, якую царызм вякамі выхоўваў у казацтва, пазаўсёды распадаецца. У годы грамадзянскай вайны казакі ваюць супроць казакаў: кулакі супроць беднаты, белыя супроць чырвоных.

Ярка і праўдзіва Шолахаў малюе сям'ю казакаў Мелехавых, кулакоў Каршуновых, памешчыкаў Лістніцкіх, батрака Міхаіла Кашавога, комуніста Івана Алексеевіча Катлярова.

Каршуновы і Лістніцкія — злейшыя ворагі рэвалюцыі. Іван Катляроў гіне ў барацьбе за ўстанаўленне совецкай улады на Дану. Міхаіл Кашавы прадаўжае справу яго жыцця.

Пакаранча ярка апісана ў рамане любоў Грыгорыя Мелехава і Аксінні Астахавай. Аўтар выявіў выключнае веданне чалавечай душы і глыбокае разуменне танчайшых душэўных рухаў сваіх герояў. Так-жа цудоўны і вобразы Ільінічны — маці Грыгорыя — і Наталькі — яго жонкі. Страсць, пяшчота, гора, мацярынская любоў, любоў бацькі да сваіх дзяцей знайшлі ў асобе Шолахава свайго натхнёнага ізабразіцеля.

Грыгорый Мелехаў — галоўны герой рамана «Ціхі Дон». Гэта мітусячыйся шукальнік праўды. У характары Мелехава многа цудоўнага, але на свядомасць яго цяжка давяць забабоны мінулага, якія царызм вякамі выхоўваў у казаках. Многія індывідуальныя рысы Грыгорыя толькі ўскладняюць яго ўнутраную барацьбу. У канцы канцоў ён адрываецца, адстае ад народа. Лепшая частка працоўнага казацтва ўжо даўно раз і назаўсёды пайшла за совецкай уладай, а Грыгорый Мелехаў усё працягваў хістацца. У канцы рамана ўжо няма моцнага, страснага Грыгорыя. Перад чытачом апустошаны, бязвольны чалавек.

Выведзеныя ў разнастайных эпізодах рамана чырвоныя камандзіры і байцы ў процівазагу асноўнаму герою рамана, Грыгорыю Мелехаву, ясна бачаць свой шлях і цвёрда ўпэўнены, што іх справа пераможа. Гэтай цвёрдай упэўненасцю дыша вобраз казака - большэвіка Міхаіла Кашавога, які ўстанаўліваў совецкую ўладу ў родным хутары. У новае жыццё ідуць свежыя расткі мелехаўскай сям'і: Дуняшка — сястра Грыгорыя, якая выйшла замуж за Міхаіла Кашавога, і Мішатка — сын Грыгорыя, які выхоўваўся ў сям'і Дуняшкі і Міхаіла.

Вобразы шолахаўскіх герояў жывуць у народзе, як любімыя і найбольш блізкія сярод вобразаў, створаных совецкай літаратурай. Многія казакі па Дану ўпэўнены, што з іх Шолахаў спісаў таго альбо іншага свайго героя. Так, напрыклад, на Дану жыве некалькі казакаў, кожны з якіх упэўнен, што Кандрата Майданікава — калгасніка з «Паднятай цаліны» — Шолахаў маляваў іменна з яго.

У гэтым сказваецца народнасць шолахаўскай творчасці, найглыбейшая праўда жыцця, якой насычаны яго творы.

Шолахаў улюблён у свой край, у данскі стэп. Пагэтаму такія цудоўныя яго карціны прыроды; ад іх так і вее стэповымі травамі, буйнай данской прыродай.

За выдаючыяся поспехі і дасягненні ў развіцці літаратуры пісьменнік узнагароджан ордэнам Леніна. Шолахаў — адзін з самых маладых акадэмікаў; ён сапраўдны член Акадэміі навук СССР. Народ аблёк яго высокім давер'ем выбраўшы ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. У 1941 годзе Міхаіл Александравіч Шолахаў атрымаў вышэйшую для пісьменніка ўзнагароду — Сталінскую прэмію першай ступені.

Ю. Лукін.

Вайна ў Еўропе, Афрыцы і Азіі

(Дзённік ваенных дзеянняў)

На англа - германскім фронце — актыўнасць германскай авіяцыі. Ў ноч на 1 чэрвеня, паведамляецца ў зводцы германскага камандвання, злучэнні германскіх самалётаў падвергалі бамбардыроўцы ваенныя аб'екты на ўзбярэжжы Заходняй і Паўднёвай Англіі. Германскія разведвальныя самалёты патапілі ў Атлантычным акіяне англійскую падводную лодку. У ноч на 2 чэрвеня буйныя злучэнні германскіх бамбардыроўшчыкаў бамбардыравалі англійскі порт Манчэстэр. Апрача таго, германская авіяцыя зрабіла налёты на порты паўднёва-заходняга і паўднёвага ўзбярэжжа Англіі.

Германскія самалёты патапілі два англійскіх транспартных параходы.

Дзеянні англійскай авіяцыі былі абмежаванымі.

* * *

У басейне **Міжземнага мора** ваенныя дзеянні на востраве Крыт, згодна зводкі германскага камандвання, падыходзяць к канцу. 1 чэрвеня германскія войскі, гаворыцца далей у зводцы, занялі порт Хора-Скакіон (у заходняй частцы паўднёвага ўзбярэжжа Крыта). Аперацыі прадаўжаюцца яшчэ ва ўнутраных раёнах востраву. Англійская авіяцыя, указваецца ў зводцы англійскага камандвання, бамбардыравала аэрадромы ў Малемі і Геракліоне.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што каля 15 тысяч салдат, удзельнічаўшых у баях на востраве Крыт, ужо прыбылі ў Егіпет. Кранаючыся ваенных дзеянняў на Крыце, агенцтва Рэйтэр піша, што ў часе аперацый на востраве з германскага боку прымала ўдзел не менш адной тысячы самалётаў. Колькасць знішчаных германскіх машын налічваецца сотнямі. Асабліва вялікія страты былі нанесены германскай парашутнай дывізіі, якая высадзілася на востраве. Па заяве прадстаўніка англійскага камандвання, гаворыцца далей, «не парашутысты, а бамбардыроўшчыкі і знішчальнікі забяспечылі захват аэрадрома Малемі, што дало магчымасць немцам высадзіць там паветраны десант». Па паведамленню каірскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, англійскія салдаты, эвакуіраваныя з востраву Крыт, выражаюць незадавальненне ў сувязі з тым, што слабасць англійскай авіяцыі дала магчымасць германскім ваенна - паветраным сілам інтэнсіўна бамбардыраваць і абстрэльваць з кулямётаў англійскія войскі. Па думцы англійскіх салдат, гэта з'явілася галоўнай прычынай паражэння англічан на Крыце.

У Паўночнай Афрыцы, у раёне Тобрука, адзначаюцца, згодна зводкі германскага камандвання, дзеянні артылерыі і разведчыкаў. Германа - італьянская авіяцыя бамбардыравала партовыя збудаванні Тобрука і стаяўшыя ў парту англійскія судны. Англійскія самалёты, адзначаецца ў англійскай зводцы, бамбардыравалі Бенгазі. Бомбы былі скінуты на мол. У сектэры Солума нічога істотнага не адбылося.

Ва Усходняй Афрыцы, у Абісініі, згодна зводкі італьянскага камандвання, прадаўжаюцца баі ў абласцях Амхара і Гала-Сідамо. У камюніке камандвання англійскіх паветраных сіл на Блізкім Усходзе паведамляецца, што англійская авіяцыя зрабіла налёт на італьянскія часці паблізу Гімбі (па захад ад Адыс-Абебы).

* * *

У Іраку, як паведамляе каірскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр, ваенныя дзеянні спыніліся ў 8 гадзін раніцы 1 чэрвеня ў сілу падпісанага напярэдадні перамір'я.

2 чэрвеня. (ТАСС).

СУСТРЭЧА ГІТЛЕРА З МУСАЛІНІ

БЕРЛІН, 2 чэрвеня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што Гітлер і Мусаліні сустрэліся сёння ў Бранеры і ў прысутнасці германскага міністра замежных спраў Рыбентропа і італьянскага міністра замежных спраў Чыано на працягу некалькіх гадзін гутарылі аб палітычным становішчы.

АРТЫЛЕРЫЙСКАЯ СТРАЛЬБА ЛЯ УЗБЯРЭЖЖА ПАЎНОЧНАЙ АФРЫКІ

НЬЮ-ЙОРК, 2 чэрвеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс з Вішы, згодна весткам, атрыманым з Оранэ (Алжыр), каля узбярэжжа Французскай Паўночнай Афрыкі была чутна жорсткая артылерыйская стральба, якая працягвалася некалькі гадзін.

РЭКВІЗІЦЫЯ ПАРАХОДАЎ У ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 2 чэрвеня. (ТАСС). Па паведамленню газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн», урадавая марская камісія рэквізіравала ў кампаніі «Амерыкэн прэзідэнт лайн» для патрэб ваенна - марскога флота шэсць параходаў агульным водазмяшчэннем у 78 тысяч тон. Усяго за мінулы тыдзень рэквізіравана 20 параходаў.

Эвакуацыя англійскіх войск з вострава Крыт

ЛОНДАН. 1 чэрвеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у камюніке англійскага ваеннага міністэрства гаворыцца, што пасля 12 дзён баёў на востраве Крыт, якія былі, несумненна, самымі жорсткімі на працягу ўсёй вайны, было прынята рашэнне эвакуіраваць англійскія войскі з вострава Крыт. Не гледзячы на велізарныя страты самалётаў і людскога састава, нанесеныя праціўнікам, стала відавочна, што нельга разлічваць на тое, што англійскія ваенна-марскія і сухапутныя сілы могуць і ў далейшым дзейнічаць на востраве Крыт, не атрымліваючы большай падтрымкі з боку авіяцыі, чым тая, якую яна магла аказаць, аперуючы з англійскіх баз у Афрыцы. Каля 15 тысяч салдат англійскіх войск ужо прыбылі ў Егіпет. Трэба прызнаць, што англічане панеслі вялікія страты.

ЛОНДАН, 1 чэрвеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у Лондане кажуць, што лічба 15.000, указаная ў камюніке англійскага ваеннага міністэрства аб эвакуацыі войск з Крыта, адносіцца толькі да імперскіх войск, але не ўключае грэчаскіх войск, якія, магчыма, таксама эвакуіраваны. Пакуль яшчэ немагчыма паведаміць агульную колькасць англійскіх узброеных сіл, якія знаходзіліся на востраве Крыт, а таксама, нельга сказаць, закончана эвакуацыя ці не. У аўтарытэтных кругах пры абмеркаванні пытання аб неабходнасці эвакуацыі падкрэсліваюць розніцу адлегласці ад англійскіх і германскіх паветраных баз да востраву Крыт. Мяркуюць, што некаторы лік немцаў, захваченых у палон на востраве Крыт, быў перакінут у Егіпет. У лонданскіх кругах заўважаюць, што генерал Фрэйберг знаходзіцца разам з часцямі, якія былі эвакуіраваны з востраву Крыт.

ВЫНІКІ ПАВЕТРАНАГА НАЛЁТУ НА ЭЙРЭ

ЛОНДАН, 2 чэрвеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у спіску афіяр апошняга налёту на Дублін значыцца 27 забітых і 88 раненых. Пяць чалавек прапалі без вестак. 20 дамоў разбурана, 55 сур'ёзна пашкоджаны.

У перадавым артыкуле дублінскай газеты «Айрыш індэпендэнт» ад 1 чэрвеня гаворыцца: «Мы ўпэўнены, што да Валера, які паведаў учора раёны, падвергшыеся бамбардыроўцы, і выказаў сваё спачуванне пацярпеўшым, выразіць рашучы пратэст ваюючым дзяржавам. З пачатку вайны Эйрэ была строга нейтральнай краінай і мае права чакаць і патрабаваць, каб цэласнасць яе тэрыторыі не парушалася якой-небудзь з ваюючых дзяржаў».

НЕДАХОП ХЛЕБА У СІРЫІ І ЛІВАНЕ

ЛОНДАН, 2 чэрвеня. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва АФІ, пытанне аб снабжэнні хлебам насельніцтва Сірыі і Лівана да новага ўраджаю сур'ёзна непакоіць мясцовыя ўлады. З прычыны позніх марозаў у раёне Дамаска загінула да 70 процантаў пасеваў.

СТАНОВІШЧА ВА ФРАНЦЫІ

БУДАПЕШТ, 2 чэрвеня. (ТАСС). Газета «Пестэр лойд» паведамляе, што ў красавіку мінулага года ва Францыі курсіравала 42462 таварных вагоны, а цяпер іх ад 25 да 27 тысяч.

З прычыны спынення заморскага гандлю і адсутнасці сувязей з калоніямі прадукцыя галоўных галін прамысловасці (металургія, тэкстыльная, скураная і іншыя) змяншылася ў параўнанні з мінулым годам на 60 — 70 процантаў. У маі ў выніку значнага скарачэння прамысловай вытворчасці налічвалася па меншай меры 460 тысяч беспрацоўных. У той жа час у сельскай гаспадарцы востры недахоп рабочых рук.

БУЙНЫ ПАЖАР У ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 2 чэрвеня. (ТАСС). Друк паведамляе, што ў Джэрсі - Сіці (у раёне Нью-Йорка) пажарам знішчаны два буйныя элеватары з зярном, частка чыгуначнага дэпо, многа барж і грузавых параходаў. Гэта — найбольш буйны пажар у раёне Нью-Йорка за апошнія годы. Убыткі перавышаюць 25 мільёнаў даляраў. Прычыны пажару пакуль невядомы. Пажар прадаўжаўся 22 гадзіны. Загінула звыш аднаго мільёна бушэляў пшаніцы, многа каўчука, нафты, скур. Большасць знішчаных тавараў прадназначалася для Англіі.

Новы кінотэатр «Радзіма» на 750 месц. пабудаваны па Ленінскай вуліцы ў абласным цэнтры — Магілёве. Фота Д. Семёнава (БЕЛТА).

У хатах-чытальнях Поразаўскага раёна

Хаты-чытальні і клубы сталі любімым месцам адпачынку сялян. Сюды збіраюцца пачытаць газету, паслухаць радыё, падзяліцца навінамі і ўражаннямі.

У клуб Падароскага сельсавета прыходзяць штодзённа 40—50 чалавек. Старыкі і моладзь знаходзяць тут чым заняцца. У клубе ёсць радыё, кожны дзень слухаюць апошнія паведамленні; устрайваюцца калектыўныя чыткі газет. Сяляне праяўляюць вялікую цікавасць да пытанняў міжнароднага становішча, да падзей з жыцця нашай краіны. Загадчык клуба тав. Давыдаў многа ўдзяляе ўвагі сваёй рабоце.

Нядрэнна працуе клуб і вёсцы Міхайлы, Міхайлаўскага сельсавета. Загадчык клубам часта праводзіць тут калектыўныя чыткі газет. Паведальнікі слухаюць радыё, гуляюць у доміно, шашкі. Весела і культурна праводзяць сяляне свой вольны ад работы час. Дрэнна толькі тое, што клуб малы і знаходзіцца ў прыватнай кватэры.

Зусім адваротнае можна бачыць у Нізянскім сельсавеце. Тут нават не ведае ніхто, дзе знаходзіцца сельскі клуб, у тым ліку і сам загадчык клуба тав. Іцін. «Мы працуем паўсюды» — гаворыць ён.

Пры бровары Нізяны ёсць добра абсталяваны вялікі клуб, але ў ім амаль не праводзіцца масавай работы. Акрамя кіно, нічога больш не бывае. Сельскага клуба ў Нізянах няма. Шафа з бібліятэкай стаіць у памяшканні сельсавета, яе ніколі ніхто не адкрывае. Ёсць радыё і патэфон, але яны ўжо доўгі час знаходзяцца ў рамонце.

Дрэнна працуе клуб у Лаўрышскім сельсавеце. Акрамя танцаў, тут нічога не праводзіцца. Памяшканне ў некультурным становішчы. Туды не заходзяць сяляне, бо не бачаць нічога цікавага. Не вядзецца масава-выхаваўчая работа. У рабоце клуба няма культуры.

Канавалёнка.

Па слядах нашых выступленняў.

«ЧАКАЙЦЕ, ВАМ ВЫПЛАЦЯЦЬ...»

Пад такім загалоўкам у нашай газеце за 24 мая была змешчана заметка, у якой гаварылася, што стахановкі бота-валяльнай фабрыкі не атрымалі грошы яшчэ ў маі месяцы, якімі яны былі прэміраваны 8 сакавіка.

Брэсцкі гарадскі камітэт партыі нам паведамляе, што ўказаныя ў заметцы факты пацвердзіліся.

Дырэкцыя бота-валяльнай фабрыкі 29 мая выдала грошы прэміраваным таварышам.

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ.

Столінскі с/г тэхнікум і школа сярэдняй сельскагаспадарчай адукацыі

Аб'яўляе набор студэнтаў на 1941-42 вучэбны год

Тэхнікум рыхтуе аграномаў-паляводаў сярэдняй кваліфікацыі

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ 3 ГАДЫ

Школа сярэдняй сельскагаспадарчай адукацыі рыхтуе тэхнікаў сельскай гаспадаркі

ТЭРМІН НАВУЧАННЯ 2 ГАДЫ

У тэхнікум і школу с/г адукацыі прымаюцца грамадзяне ва ўзросце ад 15 да 35 год, маючыя падрыхтоўку не ніжэй нипоўнай сярэдняй школы (7 годкі).

Прыём заяў у тэхнікум і школу вытвараецца з 1 чэрвеня па 18 жніўня. Заявы падаюцца на імя дырэктара. Да заявы павінны быць прыкладзены: пасведчанне аб сканчэнні няпоўнай сярэдняй школы (абавязкова ў арыгінале), даведка аб годзе нараджэння, даведка аб стане здароўя, аўтабіяграфія, даведка аб адносінах да воінскай абязанасці (для ваеннаабязаных), дзве заверанных фотакарткі і паштовых марак на 60 кап.

Паступаючыя у тэхнікум або школу сярэдняй с/г адукацыі падвергаюцца прыёмным іспытам у аб'ёме няпоўнай сярэдняй школы (7 годкі) па матэматыцы, рускай і беларускай мовах, фізіцы і Канстытуцыі Саюза ССР.

Закончыўшыя у 1941 годзе нипоўную сярэднюю школу з адзнакамі па ўказаных прадметах на „выдатна", прымаюцца у тэхнікум і школу без іспытаў і залічаюцца на стыпендыю.

Залічаныя ў тэхнікум або школу, дасягнуўшыя 16-гадовага ўзросту, пры яўцы да пачатку вучэбнага года абавязаны прадставіць пашпарт.

На стыпендыю залічваюцца згодна пастановы СНК СССР, іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам.

Пры тэхнікуме і школе ёсць столовая і пральня. Тэхнікум распалагае добра абсталяванымі кабінетамі і вучэбнай гаспадаркай.

ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ 1-га ВЕРАСНЯ.

Адрас: **гор. Столін, Пінскай абласці, сельскагаспадарчы тэхнікум.**

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДА ВЕДАМА ПРАЎЛЕННЯЎ КАЛГАСАЎ

У КАЛГАСАХ БРЭСЦКАЙ ОБЛАСЦІ З 1-га СТУДЗЕНЯ 1941 ГОДА ЎВЕДЗЕНА АБАВЯЗКОВАЕ

СТРАХАВАННЕ

пасеваў сельскагаспадарчых культур, пітомнікаў, ураджаю садоў, ягаднікаў, вінаградникаў і хмелю

на выпадак градабіцця, ліўняў, бур, пажару ка корню, вымачак, вымярзання, выправання, замаразкаў і паводкаў.

Па страхаванню табаку, махоркі, кок-сагыза, канапель, валерыяны, мяты, кміну, шалфею, далматскай рамашкі, змеягалоўніка і хмелю ўстаноўлена апрача таго

адказнасць дзяржаўнага страхавання за страты, адбыўшыяся ў выніку засухі

Праўленні калгасаў!

У выпадку пашкоджання або гібелі сельскагаспадарчых культур, у выніку ўказаных вышей стыхійных няшчасцяў паведаміце раённым страхавым інспекцыям з мэтай агляду пасеваў страхавымі інспектарамі і саставлення актаў па стратах.

УПРАЎЛЕННЕ БРЭСЦКАГА АБЛДЗЯРЖСТРАХА

ГОРТЭАТР — **4 ЧЭРВЕНЯ**

Гастролі тэатра музыкальнай камедыі БССР

СІЛЬВА Музыкальная камедыя ў 3-х дзеях, тэкст Міхайлава і Тамачэва.

Пастаноўка Геніна. Рэжысёр заслужаны артыст БССР Астахоў.

Дырыжор Постнікаў. Балетмайстар Кузнецоў.

Пачатак у 9 гадзін вечара.

Каса адкрыта з 12 да 3 гадз. дня і з 5 да 9 гадз. 30 мінут вечара.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінотэатр **1 МАЯ** — ФРАНТАВЫЯ ПАДРУГІ — Пачатак сеансаў 5, 7, 9, 11.

Кінотэатр **„КІМ"** — ТАЯМНІЧЫ ВОСТРАЎ — Пачатак сеансаў 5, 7, 9, 11.

Брэсцкай аблпракуратуры **ПАТРАБУЮЦЦА** кватэры і пакоі.

З прапановамі звяртацца па адрасу г. Брэст, вул. Гогаля 24, тэл. 4-93.

Даводзіцца да ведама **профсаюзных і гаспадарчых арганізацый**, што

ПУЦЁЎКІ

ў Брэсцкі гарадскі

піонерскі лагер

можна набыць у гаркоме комсамола.

Заяўкі прымаюцца да 10 чэрвеня

ГК ЛКСМБ.

БОЕЗДОЛЬНАЯ ДОБРААХВОТНАЯ ПАЖАРНАЯ ДРУЖЫНА — НАДЗЕЙНЫ АБАРОНЦА АД ПАЖАРАЎ.

КОМСАМОЛЬЦЫ!

Будзьце ў першых радах добраахвотных пажарных дружын. Будзьце актыўнымі праваднікамі супрацьпажарных мерапрыемстваў.

Растлумачвайце насельніцтву аб шкодзе пажараў і мерах барацьбы з імі.

Выхоўвайце ў дзяцей клапатлівыя адносіны да аховы сацыялістычнай уласнасці ад пажараў.

Беражлівыя адносіны да пажарнага інвентару і ўтрыманне яго ў пастаянай гатоўнасці — залог паспяховай барацьбы з пажарамі.

НАБЫВАЙЦЕ І ВЕРАЖЫЦЕ супрацьпажарнае абсталяванне.

ВАДА — як правільна пішуць калгаснікі ў сваім звароце, патрэбна ўсюды: для арашэння палёў і агародаў, для жывёлы і развіцця водаплаваючай птушкі, разводзення рыбы, для пабудовы тайнага мыла і электрастанцыі.

Акрамя таго, яна робіць вільготным паветра і тым самым стварае найлепшыя ўмовы для развіцця расліў.

Вада патрэбна для аховы ад пажараў.

Нарэшце без дастатковай колькасці вады немагчыма культурнае жыццё ў калгасе.

Будуйце вадаёмы і пад'язды да іх і заўсёды ўтрымлівайце іх у спраўнасці

АПА УМИУС БРЭСЦКАЙ ОБЛАСЦІ.

Арцель „Чырвоная Зара" даводзіць да ведама, што па Маскоўскай вуліцы на базары ў магазіне № 11 адкрыты **РОЗНІЧНЫ ПРОДАЖ**, усякага роду мэблі.

ПРАДАЕЦЦА

ЭЛЕКТРАМАТОР

пераменнага току, 380 вольт, магутнасцю 5 конскіх сіл.

Даведацца можна па адрасу: г. Брэст, Куйбышэва 17, кв. 8.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ АБЛАСНОЙ ГАЗЕТЫ „ЗАРА"

Званіце па тэлефону № 615

Штодзённа ад 9 гадзін раніцы да 17 гадз. 30 мін.

Тыраж 18600. Адрас рэдакцыі: Брэст, вулка Савецкая і Пушкінская № 16 28 (2-гі паверх). Тэлефоны: адказнага рэдактара — 1-17, кам. адказнага рэдактара — 7-86, адказнага сакретара і загадчыка пісем № 615, аддзелаў: сельскагаспадарчага, партыйнага і прапаганды — 1-33 і начная рэдакцыя — 7-11. Друкарня ім. Варашылава. УД—1080